# АСАБЛІВАСЦІ СТВАРЭННЯ ТЭАТРАЛЬНЫХ БУДЫНКАЎ У БЕЛАРУСКІХ ГАРАДАХ У XIX ст.

***Н. С. Валанцэвіч,***
*кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт БДУКМ*

З другой чвэрці XIX ст. пачала складвацца спрыяльная сітуацыя для стабільнага функцыянавання антрэпрызнага тэатра. З цягам часу патэнцыяльная глядацкая аўдыторыя шырылася: з жыхароў беларускіх губерняў фарміравалася эстэтычна выхаваная публіка з новымі мастацкімі густамі і інтарэсамі, сярод забаў якой былі гулянні ў парках, маскарады, тэатральныя і цыркавыя прадстаўленні. Таму пытанне наконт прыстасаваных для паказаў будынкаў становіцца вельмі надзённым, бо толькі ў Гродне спектаклі ішлі ў памяшканні былога тэатра А. Тызенгаўза, у іншых гарадах сітуацыя была складанай.

У першай палове XIX ст. тэатральныя будынкі і памяшканні з’яўляліся ўласнасцю гарадской адміністрацыі, прыватных асоб і грамадскіх арганізацый, прадстаўленні праводзіліся ў залах грамадскіх і ваенных сходаў, летніх сцэнах гарадскіх садоў і паркаў, з канца стагоддзя таксама і ў залах добраахвотных пажарных таварыстваў і чайных папячыцельства аб народнай цвярозасці.

Пытанне аб будаўніцтве стацыянарнага Гарадскога тэатра ў Мінску ўздымалася яшчэ ў 1840-х гг., калі публіка глядзела спектаклі ў перапоўненых залах былой школы езуітаў і Мінскай гімназіі, пры доме Гайдукевіча, у ратушы [4, с. 254–256]. З 1825 г. (з перапынкамі на рамонты) прыезжыя трупы выступалі ў доме купца Саламонава, дзе магло размясціцца да 430 чалавек [4, с. 256]. Пагаджаючыся з тым, што гэта карысная забава для жыхароў, Мінская гарадская дума штогод адпускала на падтрымку тэатра 2000 руб. пры гадавым бюджэце 13 000–17 000 руб. [6, л. 5 адв.]. Зразумела, што гэтай сумы не хапіла б і на пачатковы этап будаўніцтва, таму з 1860-х па 1877 гг. пад тэатральныя паказы было прыстасавана невялікае памяшканне Дваранскага сходу. Пасля ўвядзення ў 1870 г. у Мінску Гарадавога палажэння субсідыя амаль адразу перастала адпускацца. Па патрабаванні дваранства тэатр зноў быў пераведзены ў дом купца Саламонава, але ў 1884 г. будынак згарэў, і сцэнічныя прадстаўленні ў зімовы час з-за адсутнасці зручнага памяшкання спыніліся [6, л. 5 адв.]. Прадстаўнікі Мінскай гарадской управы выказвалі занепакоенасць,

РЭПОЗИТОРИЙ БГУКИ

што Мінск пры яго 70-тысячным насельніцтве не мае пастаяннага тэатра, у адрозненне ад астатніх губернскіх і многіх павятовых гарадоў: «Губернскі горад у гэтых адносінах не можа быць падобны да якога-небудзь заштатнага» [6, л. 6]. Падцверджаннем важнасці значэння тэатра ў якасці агульнадаступнай і карыснай забавы ў тагачасным грамадскім жыцці з'яўляюцца заявы аб гатоўнасці шматлікіх асоб на аказанне падтрымкі сваімі ахвяраваннямі (да 4000 руб.) на яго будаўніцтва.

Такім чынам, рашэнне праблемы наяўнасці стацыянарнага тэатральнага будынка надало б пэўную статуснасць гораду. Таму напрыканцы 1880-х гг., калі ў 1887 г. у павятовым Гомелі пачаў працаваць, а ў губернскім Магілёве будавацца (архітэктар П. Камбураў, адкрыццё ў 1888 г.) пастаянны, прыстасаванны для зімовых тэатральных паказаў будынак на 400 месцаў, улетку 1887 г. Мінская гарадская дума адзінагалосна пастанавіла: пабудаваць тэатр у вялікім скверы ў цэнтры горада, каб мець даходнасць і быць зручным для публікі [6, л. 9]. Было прапанавана разлічваць на суму 40 000 руб., якая будзе складацца з асігнаванняў ад горада ў 10 000 руб., з ахвяраванняў і субсідыі ад Міністэрства ўнутраных спраў (4000 руб.). Восенню 1887 г. камісія па будаўніцтве тэатра прызнала неабходным запрасіць чарцёжныя планы Магілёўскага і Ковенскага тэатраў і прыступіць да работ не раней, чым будуць зацверджаны планы і каштарыс, а банкаўскі працэнт будзе пагашацца з прыбыткаў ад самога тэатра [6, л. 18].

Акрамя вышэйпералічаных сродкаў на будаўніцтва тэатра з усімі прыналежнасцямі паступалі сумы ад правядзення танцавальна-музычных вечароў і маскарадаў, аматарскіх і гарадскіх спектакляў (7654 руб.), ад антрэпрынёра Картавава былі набыты дэкарацыі на суму 4250 руб. у лік арэнды за 1890 і 1891 гг. Такім чынам, у 1890 г. адкрыўся спецыяльна пабудаваны па праекце К. Казлоўскага Мінскі гарадскі тэатр (цяпер Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Я. Купалы), на будаўніцтва і ўнутранае аздабленне якога ўсяго было выдаткавана 104 480 руб. [6, л. 138].

У Віцебску да 1845 г. тэатр размяшчаўся ў асобным флігелі пры губернатарскім доме. Напрыканцы года адбылося адкрыццё ўзведзенага архітэктарам П. Чарвінскім Гарадскога тэатра на 400 месцаў. У другой палове XIX ст. зноў паўстала пытанне пра наяўнасць у губернскім горадзе тэатра, які б адпавядаў яго статусу. Таму ўзімку 1873 г. генерал-губернатар прапанаваў прыстасаваць для тэатральных паказаў гарадскі двухпавярховы будынак на Смаленскай плошчы, дзе размяшчалася паліцэйская частка [7, л. 1–

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

24]. Ужо ў красавіку Віцебскі гарадскі галава меў каштарыс і планы будучай перабудовы. Гарадская Дума, у складзе якой былі дваране, чыноўнікі, купцы, мяшчане і нават рамеснікі, вырашыла выдзяліць суму ў 8000 руб. на добраўпарадкаванне тэатра ў губернскім горадзе [7, л. 19]. У 1874 г. тэатральныя трупы выступалі ў перабудаваным будынку (архітэктар Пакроўскі). Грашовыя сродкі (2000 руб.) для рэканструкцыі таксама паступілі і са збораў ад 20 аматарскіх спектакляў, дадзеных у зімовы сезон 1873/74 г. [1, с. 3]. Гэты факт сведчыць аб пэўнай ролі тэатра ў жыцці грамадства і значнай цікавасці гараджан да гэтага віда мастацтва. У 1898 г. адбыўся капітальны рамонт Віцебскага тэатра за кошт сродкаў Камітэта папячыцельства аб народнай цвярозасці (10 000 руб.), электрычнай кампаніі Віцебскага трамвая (10 000 руб.), мясцовага дабрачыннага таварыства (6000 руб). Тэатр на 750 месцаў карыстаўся электрычным асвятленнем; на новыя дэкарацыі, заказаныя ў Маскве, было выдаткавана 500 руб. Каб пагасіць запазычанні гораду, на кожны ўваходны квіток было дададзена 10 кап. [3, с. 3].

Іншая сітуацыя складалася ў тых гарадах, дзе стацыянарны тэатр меў статус прыватнага, г.зн. будынак узводзіўся на прыватнай зямлі і за ўласны рахунак уладальніка, і не атрымоўваў субсідыі ні ад дзяржавы, ні ад горада. Напрыклад, пра Дынабургскі тэатр з глядзельнай залай на 400 месцаў, які збудаваў у 1854 г. былы камандзір Дынабургскага інжынернага арсенала генерал-маёр М. Гагельстром, мясцовы карэспандэнт «Театрального и музыкального вестника» ў 1868 г. пісаў, што «кошт збудавання тэатра, дэкарацый, касцюмаў, бібліятекі і нот ацэньваецца ў 20 000 руб., асабліва ўражвае багацце раскошных касцюмаў і мастацкія дэкарацыі, заказаныя ў Берліне, Рызе, Варшаве і Пецярбургу» [9, с. 4].

У азначаных будынках і памяшканнях 1840–1850-х г. тэатральная машынерыя была даволі прымітыўнай: люк у падлозе сцэны, блок для падымання пад каласнікі, машына для грому [4, с. 257]. З пачатку 1860-х гг. на сцэнах Беларусі пачалі фігурыраваць тыповыя павільёны. Толькі з сярэдзіны 1870-х гг. у горад за месяц да пачатку сезону прыязджаў дэкаратар, каб маляваць новыя дэкарацыі для рэпертуару сваёй трупы [5, л. 1 адв.]. Гэты момант сведчыць аб тым, што стандартны набор дэкарацый і павільёнаў ужо не задавольваў патрабаванні як тэатральных дзеячаў, так і гледачоў.

З 1870-х гг. візуальны рад спектакляў значна ўскладняецца, а

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

антрэпрэнёры ўжо маюць магчымасць арганізоўваць даволі маштабныя відовішчы. Паводле вопісу маёмасці Віцебскага тэатра за 1878 г., акрамя самых неабходных рэчаў і мэблі для сцэны, у тэатры меліся дапаможныя прадметы: пальмы, выявы птушак, надгробныя помнікі, залатыя і чыгунныя статуі для тэрасы, астранамічныя прылады для кабінетаў, мост з пераходам, пушкі, калясніцы і нават вялікі замак і лакамацію з вагонам [8, л. 27]. Дэкарацыі Магілёўскага тэатра, створаныя дэкаратарам А. Трэніным, ацэньваліся ў 2600 руб.: лес з прарэзанымі аркамі, гасцёўня з кулісамі, вокнамі, дзвярыма, мармуровая зала з аркамі, вуліца з кулісамі, дамамі і іншымі збудаваннямі, кабінет з карцінамі, каміны, рашоткі, люстэркі, бедная комната, турма, горы, дрэвы, кусты, выява паветра (аблокаў) і начнага гарызонту [6, л. 91 адв.]. Публіка пры наведванні тэатра звяртала не апошнюю ўвагу на добра напісаныя дэкарацыі, таму што ўдалае афармленне садзейнічала поспеху многіх спектакляў, напрыклад, дэкарацыі мастака І. Кураткевіча ў Мінску, М. Дзянісава ў Віцебску [4, с. 257; 2, л. 2–3].

Такім чынам, аналіз тэатральнай сітуацыі, якая склалася ў сярэдзіне XIX ст. у беларускіх гарадах, паказвае, што патрабаванні публікі ўжо не маглі быць задаволены спектаклямі, прадстаўленымі ў невялікіх прыстасаваных памяшканнях. Таму з гэтага перыяду пачынаецца этап, калі гарадскія ўлады прыкладвалі сур’ёзныя намаганні ў наладжванні тэатральнай справы. Гэта праявілася ў матэрыяльнай падтрымцы мясцовага тэатра, стварэнні тэатральнай дырэкцыі, у склад якой уваходзілі найбольш уплывовыя грамадзяне, і рэканструкцыі гарадскіх будынкаў з прыбудовай глядзельнай залы і іншых тэатральных памяшканняў. Толькі напрыканцы 1880-х гг. у буйных гарадах былі ўзведзены спецыяльныя тэатральныя будынкі, што надавала пэўную статуснасць гораду, сведчыла аб тым, што тэатр стаў натуральнай з’явай гарадскога жыцця, а тэатральныя дзеячы маглі ставіць даволі маштабныя спектаклі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

1. Витебские губернские ведомости. – 1874. – № 50.
2. Витебские губернские ведомости. – 1899. – № 248.
3. Витебский листок. – 1898. – № 75.
4. Гісторыя беларускага тэатра : у 3 т. / рэдкал.: У. І. Няфёд (гал. рэд.) [і інш.] ; АН БССР, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору. – Мінск : Навука і тэхніка, 1983–1987. – Т. 1 : Беларускі тэатр ад вытокаў да Кастрычніка 1917 г. / Г. І. Барышаў [і інш.]. – 1983. – 496 с.
5. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (далей – НГАБ). – Ф. 499. –

Воп. 1. – Спр. 1.
6. НГАБ. – Ф. 499. – Воп. 1. – Спр. 3.
7. НГАБ. – Ф. 2506. – Воп. 1. – Спр. 29.
8. НГАБ. – Ф. 2506. – Воп. 1. – Спр. 55.
9. Театральный и музыкальный вестник. – 1858. – № 27.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ